ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 15 (3567) ● ● СУБОТА, 21 КРАСАВІКА, 2018

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**20 гадоў у коле сяброў** Стар 2



**Новыя абрысы даўняга пабрацімства**

Кіраўнікі мэрый беларускага Гродна і польскага Беластока падпісалі дамову аб супрацоўніцтве Стар 3



**Лепшыя нумары для фэсту "Лемары"** Стар 4

БЕЛАРУСКАЯ ДУША

# Вялікае дрэва жыцця

## Пенсіянера Віктара Башуру са Случчыны можна лічыць найбагацейшым чалавекам

**Іна Ганчаровіч**



**Родныя людзі з роду Віктара і Галіны Башураў**

Што ёсць шчасце? Што ёсць багацце? У Велікодную пару на такія пытанні можна знайсці шматзначныя адказы. Згадаць і пра Біблію, старажытныя часы, калі Усявышні даваў шмат дзяцей ды ўнукаў тым людзям, што жылі ў ладзе-згодзе з Ім. Зрэшты, не толькі ў даўніне тое здаралася. Нядаўна я даведалася пра вельмі багатага вяскоўца са Случчыны, у якога, аднак, няма шыкоўнай вілы, дарагіх аўто і нават вялікага рахунка ў банку. Багацце Віктара Башуры — у ягонай сям'і, дзецях ды ўнуках. Калі пішуцца гэтыя нататкі, то ўнукаў у яго ўжо 68, і яшчэ двое, кажа, у дарозе. І галоўнае, што нараджэнне кожнага ўнука ў вялікай і дружнай сям'і сустракаюць з радасцю: як мілАсць, падарунак Усявышняга.

Ва ўсе часы ў беларусаў лічылася: хто мае вялікую сям'ю, моцны род — той правільным шляхам ідзе па жыцці. Дарэчы, а ці ведаеце вы, што і ў бацькоў Кастуся Міцкевіча, які праславіў свой вялікі род пад творчым псеўданімам Якуб Колас, нарадзілася 13 дзяцей? Цяпер змяніліся жыццёвыя арыенціры, прыярытэты ў грамадстве, і ўжо сям'я, у якой выхоўваецца трое дзяцей, лічыцца шматдзетнай. А для кагосьці трое — зусім няшмат. Вось і ў сям'і Віктара і Галіны Башураў з вёскі Гуляева, што пад Слуцкам, дзяцей васьмёра. А далей — будзем лічыць, бо цікавая арыфметыка: у кожнага з іх ёсць ад 7 да 11 сваіх дзяцей. Калі сабраць грамаду разам, то атрымаецца пад 90 чалавек! Адны лічаць такі разгалінаваны род Башураў з'явай унікальнай і радуюцца яго красаванню-працвітанню. Аднак знаходзяцца й скептыкі — сумняваюцца, што можна ўсіх дзетак у такіх умовах добра выхаваць, паставіць на ногі.

А вы на чым баку, шаноўныя чытачы? Зрэшты, не будзем адрывацца ад рэальнасці — бо практыка, як кажуць філосафы, ёсць найлепшы крытэрый ісціны. Вось і я мела магчымасць пераканацца, што людзі з роду Башураў — высакамаральныя, працавітыя. Сярод іх ніколі не было п'яніц, гультаёў ды іншых, як кажуць, асацыяльных элементаў. Усе дзеці Віктара і Галіны Башураў атрымалі добрую адукацыю, стварылі моцныя шматдзетныя шчаслівыя сем'і. Да таго ж усе яны вельмі ўдзячныя бацькам за сваё шчаслівае дзяцінства. Эх, такому можна толькі пазайздросціць! Бо часам жа бывае, што й адзіны сынок ці дачушка, вырасшы, выстаўляе "маральны рахунак" бацькам: маўляў, ласкі-пяшчоты, цацак-ласункаў ім у дзяцінстве не дадалі, то й добрага слова ў свой адрас не заслугоўваюць...

Вёска Гуляева, што пад Слуцкам, раней была вялікаю, а сёння там засталося некалькі хатаў, ды й тыя ажываюць хіба ў цёплую пару, бо выкарыстоўваюцца як лецішчы. "Калі да нас прыязджаюць унукі ў госці, то ў хаце нашай народу больш, чым ва ўсёй вёсцы", — жартуе Віктар Іванавіч. Маё пытанне, а чым жа вы іх корміце, здалося патрыярху вялікай сям'і дзіўным, адказвае з развагай: "Дык мы ж на зямлі жывём! А яна заўсёды людзей карміла, корміць і карміць будзе. Галоўнае — не ленавацца, працаваць".

Вось і працуюць Башуры, нягледзячы на свой салідны ўзрост. Трымаюць на падвор'і кароў, авечак, курэй, гусей. Ёсць у гаспадарцы й конь, а таксама тры гектары зямлі. Дзеці-ўнукі, вядома ж, па такой гаспадарцы дапамагаюць, хоць даўно жывуць у Мінску, Слуцку, Салігорску. → Стар. 2

З ЮБІЛЕЕМ!

## Ад Нёмана да Новасібірска

**Іван Іванаў**

**Акадэмік Валянцін Пармон, які святкуе 70-гадовы юбілей, мае моцныя родавыя карані ў Беларусі**

Хоць біяграфія вучонага пачалася 18 красавіка 1948 года ў сям'і вайскоўца ў нямецкім Брандэнбурзе, але ж ён беларус. Такое прызнанне Валянціна Мікалаевіча, які "па крыві на 100 працэнтаў з'яўляецца беларусам", мы знайшлі ў аўтабіяграфічным нарысе "Путь в научную Сибирь": змешчаны ў кнізе "Сибирью связанные судьбы" (рэдактар-складальнік Людміла Бяляўская, 2008). Акадэмік пісаў: "З вялікай упэўненасцю можна гаварыць пра тое, што прозвішча Пармон — спрадвечна беларускае. Прычым знаходзяцца яго карані, гняздо паблізу радзімы майго бацькі — у вярхоўях рэчкі Нёман, дзе раскінуўся Уздзенскі раён Мінскай вобласці. Сапраўды, там прынамсі ў дзвюх суседніх вёсках — Касцешы і Пясочнае — амаль палавіна жыхароў мае аднафамільцы. А ў тэлефонным кнізе Мінска амаль два дзясяткі нумароў тэлефонаў прыпісаны да прозвішча Пармон".

У біяграфіях акадэміка значыцца спачатку Брандэнбург, а потым адразу й Масква: у 1972-м наш зямляк закончыў факультэт малекулярнай ды хімічнай фізікі Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута. Між тым сам беларус піша, што "з канца трэцяга класа і да заканчэння адзінаццацігодкі я жыў ужо ў Мінску і лічу сябе паўнапраўным мінчанінам".

Летась Валянцін Пармон быў абраны старшынёй Сібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук, віцэ-прэзідэнтам РАН. Днямі яго павіншаваў з юбілеем Прэзідыум Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Далучаемся да віншаванняў!

ГОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

# Таму шанцуе, хто шмат працуе

**Іван Ждановіч**

**Унікальная выстава твораў Язэпа Драздовіча са збораў акадэмічнага Музея старажытнабеларускай культуры адкрылася ў Івацэвіцкім гістарычна-краязнаўчым музеі**

Так бывае: пацягнуў за нітачку — і раскруціш клубок. Пра сваю творчую супрацу з Івацэвіцкім гістарычна-краязнаўчым музеем, яго кіраўніцай Раісай Горбач крыху расказаў мне мінскі мастак Леанід Данэлія. Рыхтуючы тэкст пра выдатнага майстра з беларуска-грузінскімі родавымі каранямі, вырашыў я ўдакладніць: што ж там "данэліеўскае" ў Івацэвічах? І размова з Раісай Іванаўнай тым не абмежавалася.

"У нас тут падзея — на ўсю Брэсцкую вобласць! — радасна паведаміла субяседніца. — З 30 сакавіка ў музеі працуе выстава "Скарбніца Язэпа Драздовіча". Прысвячаецца 130-годдзю мастака. Мы ажно 30 работ майстра прывезлі з Мінска, з акадэмічнага Музея старажытнабеларускай культуры. Унікальныя рэчы. Ёсць карціны на касмічную тэматыку, ёсць Скарыніяна, і нават аўтапартрэт спадара Язэпа. На прэзентацыю людзей прыйшло вельмі шмат! Журналісты з Брэста, з нашай раёнкі. Розгалас! Цяпер — сустрэчы, экскурсіі ладзім. Вельмі ўдзячныя калегам-партнёрам з Мінска: гэта дырэктар Музея старажытнабеларускай культуры Барыс Андрэевіч Лазука зрабіў для Івацэвічаў такое свята".

Цяпер у мінскім музеі, што выступіў своеасаблівым спонсарам выставы, рамантуюцца фондавыя памяшканні — вось і вызваляюць іх часова. Раіса Горбач звярнулася да калег, жадаючы паказаць у Івацэвічах старадаўнія строі — атрамала сустрэчную прапанову. А пра творчасць Язэпа Драздовіча яна ведала з часу вучобы ў культасветвучылішчы Магілёва. Хоць сама родам з Брэста. Як, дарэчы, і мастак Леанід Данэлія. → Стар. 4



**Раіса Горбач і Барыс Лазука на выставе**

ТАЛЕНТЫ З ДЫЯСПАРЫ

# 20 гадоў у коле сяброў

## Вакальны ансамбль беларускай песні "Лянок" з Цюмені адзначае юбілей разам са шматлікімі прыхільнікамі беларускай культуры ў Сібіры

**Рыгор Гарэшка**

Да юбілею "Лянок" падышоў у цудоўнай творчай форме: летась 13 снежня вядомаму ансамблю беларускай музыкі й песні "Лянок" было прысвоена ганаровае званне "Народны аматарскі калектыў". Пра сам гурт, яго крэатыўную кіраўніцу Клаўдзію Зуеву, якая мае родавыя карані ў найпрыгажэйшым палескім горадзе Петрыкаве на Прыпяці, мы не раз пісалі. У прыватнасці, журналістка Людміла Бакланава хораша расказвала пра Клаўдзію Міхайлаўну, ясе "Лянок", калі адзначаліся 70-я ўгодкі таленавітай беларускі ("Наша любімая" — ГР, 30.08.2017). На гэты ж раз спачатку Марыя Піскун, шчырая сяброўка нашай газеты й кіраўніца беларускай суполкі ў Цюмені, паведаміла пра юбілей "Лянка". Потым і Людміла даслала здымкі, тэксты. Дарэчы, Марыю мы бачым на юбілейных здымках у складзе гурта-юбіляра. Мяркую, такая супраца — каштоўны досвед і для гурта, і для самой Марыі Іосіфаўны.

Хоць, калі верыць інтэрнэту, першыя "спеўкі" будучага "Лянка" прыпалі на восень 1998-га: 7 лістапада на святочным вечары чатыры пявунні выканалі некалькі беларускіх песень. Аднак цэлы ж год, можна лічыць, у гурта юбілейны. І вось 1 красавіка, напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі ды Расіі, у цюменьскім Палацы культуры "Строитель" ладзіўся юбілейны канцэрт ансамбля. Чуйных да песень, музыкі беларускай гледачоў — поўная зала. Было шмат віншаванняў, слоў прызнання, кветак і падарункаў. Прыехалі павіншаваць сяброў госці з Табольска, з райцэнтра Вікулава: у тых мясцінах па гэты час жыве шмат нашчадкаў беларусаў-самаходаў. Выступалі й запрошаныя гурты, сярод якіх і Сямейны беларускі ансамбль "Спадчына". Сярод ганаровых гасцей — Ганаровы генеральны консул Беларусі ў Цюмені Уладзімір Шугля, намеснік старшыні Цюменьскай абласной думы Віктар Рэйн, прадстаўнікі адміністрацыі вобласці… За плённую працу на ніве Беларушчыны і "Лянок", і Клаўдзія Зуева ўшанаваны Ганаровымі граматамі Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў Саўміна Беларусі, адзначаны падзякай Пасольства Беларусі ў Расіі. Павіншаваў калектыў і лётчык-Герой Расіі Уладзімір Шарпатаў, сябар цюменьскіх беларусаў.



**Ганаровы генеральны консул Беларусі ў Цюмені Уладзімір Шугля з ансамблем "Лянок"**

На юбілейнай вечарыне згадвалі, што пасля "спевак чатырох" у лістападзе 98-га крыху пазней пры Цюменьскай абласной грамадскай арганізацыі "Беларусь" вырашылі стварыць ансамбль. І спачатку яго ўзначаліла Тамара Грыгор'ева. "Назву абралі гучную, запамінальную — "Лянок". Дарэчы, кветкі лёну ёсць нават на гербе Рэспублікі Беларусь, гэта кветка-сімвал Беларусі", — казала пазней журналістам Клаўдзія Зуева. Яна ж з 2002 года і згадзілася кіраваць каларытным ансамблем. А на той час выкладала музыку ў 70-й школе, дзе таксама пашырала родную ёй беларускую культуру. Таму на юбілей і выкладчыкі школы накіравалі ёй вельмі цёплае віншаванне. Яно даслана ў рэдакцыю "Голасу Радзімы" і да яго, пэўна, могуць далучыцца ўсе, хто ведае Клаўдзію Міхайлаўну. Цытуем: "На працягу ўсяго вашага культурат-ворчага, педагагічнага, канцэртнага лёсу вы дорыце дзецям і дарослым радасць музыкі, шчасце дотыку да чыстых крыніцам народнай культуры. Мы ўдзячныя вам за цудоўныя майстар-класы для студэнтаў і выкладчыкаў: вам удалося прывіць любоў да музыкі й народнай песні. Мы схіляемся перад вашым талентам дарыць радасць ігры на акардэоне, адкрываць ім шлях у свет творчасці й цудоўнай музыкі. Мы дзівімся вашай энергіі, уменню жыць натхнёна й проста. Радасна сустракаць кожны дзень і з усмешкай ісці на сустрэчу людзям ды ўсім "паўсядзённым задачам быцця". Мы паважаем вас за адданасць беларускай культуры! Вы ніколі не забывалі сваю родную культуру і, вандруючы па Расіі, захавалі родную мову, родную песню, родныя традыцыі ды шчодра дарылі нам мастацтва й культуру Беларусі. Нам падабаецца вашае пазітыўнае стаўленне да свету й людзей, вашае ўменне разумець, дапамагаць і дараваць, вашае жаданне зрабіць усіх — дабрэйшымі ды лепшымі. Нам падабаецца вашая творчасць і сутворчасць з прыродай, соцыумам і культурай". Сапраўды, вельмі хораша й душэўна!

А журналісты з Цюмені пасля канцэрта пішуць: "Безумоўна, ансамбль Зуевай захапляе! Выдатныя касцюмы, выдатныя галасы, цудоўныя песні натхняюць, цешаць вока й слых."

СПАДЧЫНА

## Скарбы з Палесся

**Алесь Мурочак**

**Мінскі фолк-гурт Vuraj запісвае новы альбом "Lito"**

Чытачы газеты ведаюць пра гэты адметны гурт, ягонага таленавітага кіраўніка-спевака Сяргея Доўгушава: ён, у прыватнасці, даваў летась мастар-клас у Новасібірскім цэнтры беларускай культуры. У сацыяльных сетках з'явілася абвестка, што фолк-група Vuraj працуе над запісам свайго чацвёртага ўжо альбома. Ён мае назву "Lito", і ў аснову творчага праекта пакладзены народныя песні беларускага Палесся. Цяпер на адной з краўдфандынгавых платформ ідзе збор сродкаў "пад альбом", а тых, хто асабліва паспрыяе запісу й выпуску кампакт-дыска, музыкі гатовы нават запрасіць з сабой у этнаграфічную экспедыцыю.

Але што такое літо? Вось так, адным словам на Палессі, аказваецца, называюць цыкл абрадавых песень, у якіх знайшлі адлюстраванне звычаі ды павер'і палешукоў. А праект "Lito" — гэта беражліва сабраныя, вывучаныя, пераасэнсаваныя ды перастворанныя каляндарна-абрадавыя песні беларускага Палесся. Да якіх даўно праяўляюць вялікую цікавасць даследчыкі фальклору з розных краін. І Сяргей Доўгушаў ды Vuraj на працягу чатырох гадоў шукалі-выслухвалі песні пад час сваіх этнаэкспедыцый, знаходзілі — а потым надавалі кожнай з іх адметнае "вурайскае" гучанне.

Як кажуць музыкі, запрашаючы ахвочых далучыцца да праекта, у новым альбоме будзе падкрэслена ўнікальнасць рэгіёнаў Палесся. Аўтэнтычныя мелодыі ды музычны строй, асаблівасці мікрамоваў і дыялектаў — усё гэта яны мяркуюць ашчадна захаваць, каб перадаць магію абрадавых песень, таямніцу старажытных рытуалаў ды сілу повязі з продкамі. Дарэчы, пад час запісу будуць гучаць колавая ліра ды народныя духавыя інструменты.

БЕЛАРУСКАЯ ДУША

# Вялікае дрэва жыцця

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Прыязджаюць да іх кожнае лета, дый так "заглядваюць", не забываюць бацькоў. "Раней у вёсках мецъ вялікае сямейства лічылася нормай, — дзеліцца жыццёвым досведам суразмоўца. — У маіх бацькоў, напрыклад, было сямёра дзяцей. У мяне — васьмёра, і ўсе вельмі ўдалыя. Стварылі яны свае сем'і, узялі з нас прыклад, а некаторыя ўжо па колькасці дзяцей нас абагналі".

Са сваёй будучай жонкай Галінай Віктар Іванавіч пазнаёміўся ў Магілёве. Нейк, расказвае, паехаў туды ў госці, а Галя там вучылася: "Пазнаёміліся. Стварылі сям'ю. Потым Галя дзяцей гадавала, па гаспадарцы завіхалася — і я таксама не ленаваўся, працаваў". Вядома ж, працаваць трэба было шмат, бо сям'я ж вялікая. Асвоіў ён майстэрства муляра, клаў людзям файныя печы — і праславіўся майстар далёка за межамі Случчыны. Дарэчы, пра Віктара Башуру менавіта як добрага майстра камінаў ды вельмі багатага на ўнукаў дзядулю я ўпершыню й пачула ў Бабруйску, а гэта 150 км ад Слуцка.

Пашанцавала Віктару Іванавічу не толькі з жонкай, дзецьмі, але і з унукамі. Так, за апошнія 18 гадоў іх нарадзілася ў яго 68, і яшчэ чакаюць прыбытку. І ўсе вельмі любімыя. Імёны ў дзетак розныя, праўда, ёсць і паўтарэнні: дзве Веранікі, дзве Сняжаны, столькі ж Максімаў і Ягораў, а яшчэ і Рычард, Мішэль, Заміра… Усіх, запэўнівае дзядуля, ён памятае па імёнах, ведае іх дні нараджэння, а яны ў вялікім родзе — асобная тэма. Увявіце сабе: колькі падарункаў трэба! І дорацъ іх бабуля з дзядулем — каб нікога не пакрыўдзіць, вылучаюць пэўную суму. Ды і ўнукі таксама іх не забываюць. Гасцююць кожнае лета, але — па чарзе, каб не ўсе адразу. "Хата вялікая, можа даць прытулак усім, ды й накарміць — не складана. А вось прыглядзець нам за ўсімі няпроста: бо ўжо ж надта шустрыя!" — нібы апраўдваецца Віктар Іванавіч. А на яго юбілей (у лютым дзядулю споўнілася 75!) амаль усё сямейства з'ехалася ў Гуляева "пагуляць". Свята было на славу: дзеці, унукі ды музычныя падарункі на розныя густы.

Дарэчы, пра музыку: вельмі музычнымі атрымліваюцца ўсе ўнукі Віктара Іванавіча! Таленты, кажа Ірына, дачка ягоная, перадаюцца ўнукам ад дзеда. Сама ж Ірына — мама-гераіня з Мінска: у яе 10 дзяцей. Расказвае з ахвотай: "Наш дзядуля добра граў на гітары, была ў нас і маленькая мандаліна. Тата не толькі спявае прыгожа, але й добра падбіраў музыку на слых. І мае сямёра старэйшых дзяцей ходзяць у музычную школу, граюць на сямі розных музінструментах. Так што з часам, пэўна, будзе сямейны аркестр. Дзеці маіх братоў і сясцёр таксама навучаюцца музыцы".

З вялікай удзячнасцю Ірына Стромская гаворыць пра бацькоў: "Вялікі дзякуй ім за нашае вельмі добрае дзяцінства, за тыя цяпло й клопат, якія мы атрымалі ад іх. Усе мы любім прыязджаць у родную вёску, атрымліваем асалоду ад прыроды, цяпла бацькоўскае хаты. Згадваем дзяцінства: як вярталіся са школы, зімой каталіся на санках і каньках, летам бегалі ў лес па грыбы, ягады. І галоўнае: мы ніколі не адчувалі сябе ні ў чым абдзеленымі ці "ўшчэмленымі". Нам хапала бацькоўскай любові, увагі, да таго ж матэрыяльна мы ніколі ні ў чым не мелі патрэбы. Вядома ж, гэта — заслуга бацькоў, з якіх мы бярэм прыклад". Гаворыць Ірына ціхім, спакойным голасам. Гледзячы на яе, пераконваюся ў чарговы раз: чым больш нараджае жанчына, тым маладзей выглядае. Вядома ж, гэта калі за добрым мужам. А з ім Ірыне таксама пашанцавала: добры, спагадлівы, працавіты. Дарэчы, прызналася Ірына, ён быў адзіным дзіцем у сям'і, але не пабаяўся з любімай стварыць сваю вялікую сям'ю: "Ён жа бачыць, як шмат у гэтым добрага. Нашы дзеці робяць нас больш шчаслівымі ды багатымі. Гэта ўжо, можна сказаць, навуковы факт!".



**Віктар і Галіна Башуры**

То можа й варта прыслухацца да развагаў-меркаванняў Ірыны, удзячнай дачкі самага багатага дзядулі, шчаслівай мамы дзесяці дзяцей.

**ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?**

# Мінорныя ноты ў мелодыі фестывалю

## Юбілейны XV абласны конкурс-фестываль дзіцяча-юнацкага мастацтва завяршыўся ў Самары канцэртам-рэквіемам

**Мікалай Бойка**



**У складзе вакальнага гурта "Сузор'е" і яго кіраўніца Алена Кірылашава (злева)**

Жыццё часта ўносіць карэктывы ў нашы планы. Напярэдадні Дня яднання народаў Беларусі ды Расіі ў Самары штогод праходзіць абласны Конкурс-фестываль дзіцяча-юнацкага мастацтва "Единство". Ладзіць яго беларуская суполка пры падтрымцы гарадской адміністрацыі, абласнога Дома дружбы народаў. А сёлета фармат конкурсу-фестывалю змяніўся ў сувязі з трагічнымі падзеямі 25 сакавіка ў горадзе Кемераве. Да таго ж у ноч з 26 на 27 сакавіка раптоўна памёр віцэ-прэзідэнт Самарскай абласной грамадскай арганізацыі "Руска-Беларускае Братэрства 2000" Мікалай Чырко.

Было тэрмінова сабрана пазачарговае пасяджэнне праўлення суполкі з запрашэннем актыву. "Мы вырашылі змяніць фармат фестывальных мерапрыемстваў, — гаворыць кіраўніца суполкі Ірына Глуская. — І замест святочнага Гала-канцэрта лаўрэатаў фестывалю на сцэне Дома культуры "Победа" вырашылі правесці канцэрт-рэквіем "У адзінстве — наша сіла!" на сцэне Дома дружбы народаў. У праграму ўнеслі адпаведныя змены, уключылі Мінуту маўчання ў памяць па загінулых у Кемераве. І ў памяць пра нашага дарагога Мікалая Сцяпанавіча. Мы смуткуем самі, выказваем спачуванні яго родным і блізкім".

Мінуту маўчання аб'явілі пасля песні "Верните память" — яе выконвалі Анастасія Гуркіна і Арына Камісарава, салісткі гурта "Каданс". Новы сэнс набылі на канцэрце словы песні: "Протянем руки к тем, глаза чьи слёз полны,/ Чей дом осиротел от ужаса беды./ Помянем их, прошу, помянем миром их…". Атмасфера суперажывання і ўпэўненасці ў тым, што перажыць гора можна толькі разам, панавала ў зале цягам усёй канцэртнай праграмы. Пра тое гаварылі кіраўнікі шэрагу нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў вобласці, запрошаныя на канцэрт-рэквіем. На адрас яго арганізатараў, удзельнікаў і гледачоў прыйшло прывітанне і ад Пасла Беларусі ў Расіі Ігара Петрышэнкі. "Мы ўсе вельмі адказна рыхтаваліся да канцэртнай праграмы, — гаворыць Ірына Глуская. — Напрыклад, беларускі вакальны гурт "Сузор'е", якім кіруе Алена Кірылашава, цяпер мае ў рэпертуары песню "Белорусы России" нашага сябра, спевака й кампазітара, заслужанага работніка культуры Расіі Сяргея Костачкі. Летась ён даслаў нам у падарунак фанаграму, тэкст песні. У нашых артыстаў былі на канцэрце новыя сцэнічныя касцюмы, абутак".

Па традыцыі праграму канцэрта-рэквіема адкрываў беларускі вакальны ансамбль "Каданс", якім кіруе Іна Сухачэўская: гучалі як рускія, так і беларускія песні. Лізавета Глубінец з цэнтра "Творчество" (дарэчы, педагогам у яе — таксама Іна Ігараўна) душэўна спявала "Рэха жураўлінае". Хораша выступілі Алена Арэшына, Дар'я Міцькіных, Мацвей Малінін ды іншыя лаўрэаты. А Макар Даброў з 176-й школы (педагог Алена Балвашэнкава) выдатна прачытаў у арыгінале верш Янкі Купалы "Роднае слова". Спадабаліся гледачам і беларускія танцавальныя кампазіцыі: выступалі юныя артысты з калектыва "Мозаика" (педагог Наталля Меліхава). А гурт "Серпантин" (педагог Людміла Елісеева) да фэсту падрыхтаваў рускі народны танец "Барыня" і сцэнічную кампазіцыю "Россия, мы — дети твои".

Звыш 20 лепшых нумароў лаўрэатаў фестывалю мастацтваў "Единство" былі выкананы ў праграме канцэрта-рэквіема.

## Родам з-пад Антопаля

**Раптоўна памёр віцэ-прэзідэнт Самарскай абласной грамадскай арганізацыі беларусаў і выхадцаў з Беларусі "Руска-Беларускае Братэрства 2000" Мікалай Чырко**

Вялікая страта: адышоў у Вечнасць працавіты беларус, добры чалавек, цудоўны таварыш. Не стала яго на 70-м годзе жыцця ў ноч з 26 на 27 сакавіка. Смуткуем самі, выказваем глыбокія спачуванні родным і блізкім нашага дарагога Мікалая Сцяпанавіча.

Зусім трохі не дажыў наш сябар да юбілею. Нарадзіўся ж Мікалай Сцяпанавіч 23 красавіка 1948 года у вёсцы Дзераўная Драгічынскага раёна Брэстчыны. Пасля заканчэння Брэсцкага радыётэхнікума (1966) быў размеркаваны на Куйбышаўскі ракетабудаўнічы завод "Прогресс" — там і працаваў па 1988 год начальнікам цэха, на іншых пасадах. Потым два гады быў намеснікам гендырэктара вытворчага аб'яднання "Экран", у 1990-91-м — намеснікам гендырэктара ВА "Красный молот" у горадзе Грозным, а ў 1992-94-м — прадстаўніком ВА "Кагалымнефтегаз". Калі ж спатрэбіліся новыя веды, наш суплямённік у 1995-96 гадах вучыўся ў Пляханаўскай акадэміі народнай гаспадаркі, пасля яе заканчэння працаваў старшынёй праўлення Аган-банка, затым перайшоў у прадстаўніцтва "РАО ЕЭС России" ў Самары.

З 2001-га Мікалай Сцяпанавіч быў у шэрагах актывістаў суполкі, у 2003 годзе на агульным сходзе абраны яе віцэ-прэзідэнтам. З разуменнем ставіліся да ягонай грамадскай дзейнасці жонка, Галіна Аляксандраўна, дачка Таццяна (у замужжы Няфёдава), якая нарадзіла Мікалаю Сцяпанавічу дваіх унукаў. Сам жа ён захапляўся паляваннем, рыбалкай, любіў працаваць на дачным участку.



**Мікалай Чырко**

Не забываў Мікалай Чырко свае родавыя карані, родную вёску Дзераўная: пад Антопалем, у Іменінскім сельсавеце. Пра тое, што сын мясцовай настаўніцы пачатковых класаў прыязджае з Расіі дадому разам з жонкаю, дачкою, унукамі — пабываць на магілах бацькоў, наведаць родзічаў і блізкіх — пісала райгазета "Драгічынскі веснік". У Дзетавіцкай сярэдняй школе, што за 6 км ад Дзераўной, Мікалай Чырко заканчваў старэйшыя класы. "Бацька Мікалая працаваў брыгадзірам-агароднікам у тагачасным калгасе "Радзіма", і сын часта дапамагаў яму", — пісала пра земляка ў газеце Ніна Клапоць, ветэран педагагічнай працы з вёскі Дзераўная.

**Праўленне і сябры Самарскай абласной грамадскай арганізацыі беларусаў і выхадцаў з Беларусі "Руска-Беларускае Братэрства 2000"**

**СУСЕДЗІ**

# Новыя абрысы даўняга пабрацімства

**Іван Іванаў**

**Кіраўнікі мэрый беларускага Гродна і польскага Беластока падпісалі дамову аб супрацоўніцтве**

У СМІ з'явіліся весткі пра тое, што Беласток і Гродна 16 сакавіка ўжо афіцыйна сталі гарадамі-партнёрамі. Дамову, якая пашырае шматбаковае супрацоўніцтва двух гарадоў, надае яму новы імпульс, падпісалі старшыня Гродзенскага гарвыканкама Мечыслаў Гой і прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускалоўскі. Мяркуецца, што такім чынам удасца зблізіць мясцовыя ўстановы, паспрыяць іх больш цеснай супрацы. Бакі зацікаўлены ў тым, каб ішоў абмен досведам у арганізацыі мясцовага самакіравання. Гродзенцы й беластокцы будуць разам ладзіць розныя сацыяльныя, культурныя, спартыўныя мерапрыемствы.

Журналістам Тадэвуш Трускалоўскі патлумачыў, што, на яго думку, міжнароднае супрацоўніцтва — гэта "найбольш эфектыўны спосаб прасоўвання горада за мяжой". Да таго ж важнае й прамое ўзаемадзеянне па такіх пытаннях, як прыцягненне інвестыцый, развіццё турызму, культурнага абмену.

Між тым польскія СМІ пішуць, што гэта ўжо не першая дамова пра супрацоўніцтва. І, маўляў, дзеля чаго яшчэ раз "братацца"? Сапраўды, і на сайце Гродзенскага гарвыканкама ёсць інфармацыя, што Гродна і Беласток — гарады-пабрацімы з 1960 года. Ды не варта забываць, што з таго часу, як кажуць, шмат вады выцекла: больш за паўвека прайшло. І Беларусь цяпер — не савецкая рэспубліка, а незалежная дзяржава, і Польшча — у складзе Еўразвяза. Дый новых магчымасцяў для супрацы з'явілася шмат. Але цікава ж пачытаць і ранейшую інфармацыю пра гарады-пабрацімы: "Сяброўства



**Каложская царква ў Гродне**

з Беластокам праверана часам — гэта наш першы з пароднёных гарадоў. Пагадненне аб пабрацімскіх сувязях падпісана ў 1960 годзе. З 2004 па 2007 гады арганізацыямі вобласці сумесна з польскімі партнёрамі распрацаваны й рэалізаваны шэраг праектаў: "Развіццё трансгранічнага турызму ў рэгіёне Белавежская пушча", "Невядомая Еўропа: развіццё турыстычнай інфраструктуры польска-беларускага памежжа ў раёне Аўгустоўскага канала і Нёмана" ды іншыя. Цеснае супрацоўніцтва завязалася ў культурнай сферы. Штогод праводзіцца рэгіянальны фестываль "Артыстычныя сустрэчы: Гродна — Беласток", у якім прымаюць удзел творчыя калектывы Гродна і Беластока".

Пацвердзіць яшчэ раз сваю вернасць у дружбе — гэта, мяркую, значна лепш, чым абмяжоўвацца фармальнымі кантактамі. Так што ў добры час, панове-спадары! Нагадаем, што ў ліку пабрацімаў Гродна значацца яшчэ Лімож (Францыя), Друскінінкай (Літва), Дзяржынск (Ніжагародская вобласць Расіі), Хімкі (Маскоўская вобласць), Алітус (Літва), Чабаксары (Чувашыя, Расія), Ашкелон (Ізраіль), Туапсінскі раён (Краснадарскі край, Расія), Кралева (Сербія), Тамбоў (Расія) ды іншыя. З шэрагам гарадоў падпісаны дамовы аб супрацоўніцтве.

# Таму шанцуе, хто шмат працуе

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

"Для нас Леанід Пятровіч яшчэ ў 2013-м зрабіў цікавы праект: прапанаваў афармленне для ўсіх шасці залаў музея, з адлюстраваннем усіх часавых перыядаў мясцовай гісторыі, — удакладняе Раіса Горбач. — А пачалі мы супрацоўнічаць, бо пабачылі, як прыгожа выглядае ім афармлены музей у Бярозе: суседні раён. Працу мастака падтрымаў наш райвыканкам, і макет будучага афармлення Івацэвіцкага гістарычна-краязнаўчага музея ўжо ў горадзе экспанаваўся. Але з рэалізацыя задумы — праблема: сродкаў няма... Між тым у Івацэвічаў у 2019-м будзе юбілей: 500 гадоў гораду. І вельмі б хацелася нам справу неяк зрушыць. Будзем удзячны ўсім, хто да яе далучыцца. Можа й сярод чытачоў газеты "Голас Радзімы", іх знаёмых таксама ёсць ураджэнцы Івацэвіччыны? Давайце разам у Год малой радзімы зробім карысную справу!"

Разважалі мы з Раісай Іванаўнай, якая з 2006-га кіруе музеем, тым часам: у раённым бюджэце грошай на яго рэканструкцыю, стварэнне пастаянных экспазіцый няма. Ды не дарма ж у народзе кажуць: таму шанцуе, хто й сам шмат працуе. А музейшчыкі ў Івацэвічах імкнуцца, каб музей папаўняўся цікавымі экспанатамі, каб наведвала яго больш людзей. Апошняя выстава — таму сведчаннем. Хутка будзе аб'яўлены ў музеі Конкурс юных мастакоў: да 500-годдзя горада. Між тым на Івацэвіччыне шмат мясцін, вартых мастацкай увагі, цікавых для турыстаў. Скажам, знакаміты наш супляменнік Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка нарадзіўся ў 1746 годзе ў фальварку Марачоўшчына, непадалёк ад мястэчка Косава. Ваенны і дзяржаўны дзеяч, таленавіты інжынер, кіраўнік паўстання 1794 года цяпер вядомы і як нацыянальны герой ЗША, Польшчы, ганаровы грамадзянін Францыі. У Марачоўшчыне ёсць Музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі. Плануецца, што матэрыялы пра слаўнага ўраджэнца Івацэвіччыны зоймуць важнае месца і ў новай экспазіцыі Краязнаўчага музея.



Музей-сядзіба Тадэвуша Касцюшкі ў былым фальварку Марачоўшчына. Івацэвіцкі раён

Будуць там і аповеды пра іншых вядомых землякоў, сярод якіх партызан, камсамолец Мікалай Гойшык. Родам ён з мясцовай вёскі Воля, подзвіг здзейсніў 24 красавіка 1944 года, падарваўшы фашысцкі цягнік на чыгунцы паміж Іванцэвічамі ды вёскай Міхнавічы. На тым падрыве загінуў і Мікалай, памяць пра якога шануюць у Беларусі. Дарэчы, яшчэ за савецкім часам для ўшанавання памяці героя па просьбе мамы Колі Гойшыка быў створаны ў Івацэвічах народны музей па вул. Дзяржынскага, 18: экспазіцыя расказвала пра гісторыю вайны і партызанскага руху на тэрыторыі раёна — гэта і быў прадвеснік гістарычна-краязнаўчага музея. Ёсць яшчэ на Івацэвіччыне Музей партызанскай славы — ва ўрочышчы Хаваншчына, каля вёскі Корачын. Пад час вайны там была база штаба партызанскага злучэння Брэсцкай вобласці. Хоць будынак па вул. Паштовая, 7 Івацэвіцкі гістарычна-краязнаўчы



Я. Драздовіч. Аўтапартрэт

музей атрымаў у 2009-м, аднак пастаянных экспазіцый па гэты час у ім няма. "Усе матэрыялы пра жыццё і подзвіг юнага героя Мікалая Гойшыка размесцім у ваеннай экспазіцыі — гэта будзе даніна ўдзячнай памяці ўсім, хто загінуў у баях за свабоду, гонар і незалежнасць нашай Радзімы", — пісала Раіса Горбач у адным з артыкулаў.

У планах івацэвіцкіх музейшчыкаў — падрабязна расказаць і пра Канал Агінскага, які праходзіць па тэрыторыі раёна, і пра лыжную фабрыку ў Целяханах, на якой будуць рабіць сучасныя лыжы. І, безумоўна, пра вядомых ураджэнцаў раёна, сярод якіх гісторык, лекар і літаратар Міхал Гамаліцкі, пісьменнікі Яраслаў Пархута, Уладзімір Мароз, гісторык Генадзь Сагановіч, журналіст Леанід Екель, краязнаўца Алесь Зайка… З вёскі Выганашчы родам і палітычны дзеяч, дыпламат, Міністр інфармацыі Беларусі (2003—2009) Уладзімір Русакевіч.

Ёсць яшчэ на Івацэвіччыне і такая цікавая справа, як "Выганашчанская фартэцыя": ваенна-гістарычны фестываль-рэканструкцыя. На праект былі выдзелены аўстрыйскі грант. Упершыню фестываль-рэканструкцыя прайшоў у Выганашах 19 верасня 2015 года, сабраў каля тысячы гледачоў і ўдзельнікаў. Фестываль быў прымеркаваны да 100-годдзя падзей Першай сусветнай вайны на Целяханскай зямлі: там ішлі вялікія баі, па некалькі разоў адны і тыя ж траншэі пераходзілі з рук у рукі, пакуль фронт стала не спыніўся на мяжы Агінскага канала. Які, дарэчы, быў важнаю часткай воднага шляху з Дняпра ў Нёман: даўжыня ў яго 54 кіламетры. А праходзіць канал на тэрыторыі сучасных Пінскага, Івацэвіцкага і Ляхавіцкага раёнаў Брэсцкай вобласці. Ёсць у раёне яшчэ адзін цікавы брэнд: "вёска асілкаў" Дабромысль. Пра тое пісала газета "Звязда": там родавыя карані асілка Руслана Багірава (двухметровы гігант вагой 150 кілаграмаў), вядомага на Брэстчыне гіравіка Алега Данчанкава.

Івацэвіччына — багатая на гісторыю зямля. І Раіса Горбач мае надзею, што ўраджэнцы Івацэвіччыны з замежжа таксама знойдуць магчымаць у Год малой радзімы звязацца з музеем, наведаць Бацькаўшчыну, расказаць пра сябе, а па сілах і дапамагчы ў стварэнні новай музейнай экспазіцыі.

**Дарэчы.** На пачатку красавіка ў Івацэвічах адкрыўся першы ў Беларусі лесанасенны комплекс. Два гады таму Міжнародны банк рэканструкцыі й развіцця выдзеліў Мінлясгасу каля 40 мільёнаў даляраў на развіццё лясной гаспадаркі краіны. Сродкі пайшлі ў тым ліку й на будаўніцтва такіх цэнтраў. Кошт Івацэвіцкага — звыш 5 мільёнаў рублёў. Пасадачны матэрыял у ім вырошчваецца з закрытай каранёвай сістэмай: у спецыяльных касетах з грунтам. Гэта дасць значную эканомію насення, і расліны будуць лепш прыжывацца пры высадцы. Прычым высаджваць такія дрэўцы можна будзе з вясны па восень.

РАЗАМ

# Лепшыя нумары для фэсту "Лемары"

Іван Іванаў

**Больш за 250 юных спевакоў, музыкантаў з 9 краін паўдзельнічалі ў Міжнародным конкурсе-фэсце дзіцячай песенна-музычнай творчасці**

Здорава ўсё ж, калі прэс-канферэнцыі праходзяць нефармальна. З душой, і нават спевамі. Вось як напярэдадні фэсту "Лемары": у Прэс-цэнтры Дома прэсы разам з вядомымі журналістамі пытанні арганізатарам задавалі й юныя карэспандэнты газеты "Зорька". Спачатку пра таленавітых сяброў газеты з Дзіцячага цэнтра развіцця й творчасці, сямейнай студыі "Лемары" цёпла гаварыла галоўрэд "Зорькі" Людміла Грамовіч, даўно вядомая ў журналісцкай супольнасці дабрачыннымі справамі, самаадданай працай з дзецьмі. Потым падрабязней пра міжнародны фэст-праект расказала кіраўніца студыі, старшыня аргкамітэта фэсту Алена Ляшчынская.

Аказваецца, студыя "Лемары" немаленькая: 176 юных талентаў у ёй займаецца. Сярод іх і дачка самой Алены Анатолеўны: вядомая ўжо вакалістка Марыя-Луіза Ляшчынская. Выхаванцы студыі выступаюць на міжнародных конкурсах, заваёўваюць прызавыя месцы. Зрэшты, пра тое больш падрабязна можна даведацца на сайце http://lemari.by, а таксама ў групах студыі ў сацсетках. "Свята ў нас – цудоўнае, шматфарбнае, – казала мне Алена Ляшчынская, калі фэст ішоў поўным ходам. – Мы правялі вялікую арганізацыйную працу, а Канцэртная зала "Атлант", у якой праходзіць конкурс, – вельмі зручнае месца для юных артыстаў. Гасцей прыехала шмат, у фэсце-конкурсе ўдзельнічаюць 252 юныя спевакі, музыканты з 9 краін: гэта, вядома ж, прадстаўнікі Беларусі, а таксама Албаніі, Балгарыі, Кітая, Косава, Латвіі, Расіі, Украіны, Швейцарыі. Спадзяемся, і кіраўнікі беларускіх дзіцячых гуртоў замежжа, пачуўшы пра наш праект, на будучыню ў ім паўдзельнічаюць".




Людміла Грамовіч (справа) і Дарэна Ігнаценка

Артысты студыі, што былі на прэс-канферэнцыі, спявалі нам песні. Сваё добрыя словы казала ім "у фестывальную дарогу" Дарэна Ігнаценка, выпускніца Мінскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў. Яна неаднаразова ўдзельнічала ў падобных фэстах, заваёўвала на іх Гран-пры, з'яўляецца лаўрэаткай Спецфонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі. Дарэна і ўзначальвала каманду юных карэспандэнтаў на Міжнародным фэсце "Лемары".

ВЕСТКІ

# Выстава з музыкай

Янка Яцкавец

**Да 85-гадовага юбілею Вялікага тэатра Беларусі разгорнута выстава ў Нацыянальнай бібліятэцы**

Адметнасць юбілею Вялікага ў тым, што святкуецца ён на розных культурных пляцоўках беларускай сталіцы. Так, у Міжнародны дзень тэатра ў Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" адкрылася выстава "Тэатр. Inside". У экспазіцыі аматары тэатра ўбачылі эскізы касцюмаў і дэкарацый, сцэнічныя ўборы, афішы, постэры, тэатральную бутафорыю ды фатаграфіі – так прадстаўлена была найновая гісторыя Вялікага тэатра Беларусі.

Днямі ў Нацыянальнай бібліятэцы адкрылася выстава "З тых даўніх дзён ды сённяшняга часу": да юбілею Вялікага. У экспазіцыі — 70 тэатральных афіш і плакатаў розных гадоў, якія адлюстроўваюць гісторыю тэатра. У прыватнасці, можна пабачыць афішы першага спектакля "Кармэн" Жоржа Бізэ ды першага нацыянальнага балета "Салавей" Міхаіла Крошнера. На адкрыцці выставы спявалі салісты, гучала жывая музыка.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 287 16 91
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 287 15 32; факс: +375 17 287 15 26
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1930. **Заказ:** 541
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2018